**В. С. Забродская**

# ПОШУКІ ІДЭАЛУ Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Ідэал прыгажосці, пакладзены у аснову творчасці М. Багдановіча і прыцягальны для шматлікіх майстроў паэтычнага слова ўсіх часоў і народаў, спрычыніўся да таго, что творчасць паэта носіць ярка выражаны агульнаеўрапейскі характар.

Паэт не толькі эмацыянальна і экспрэсіўна малюе перад вачыма чытача рэалістычныя карціны прыроды, але і звяртае ўвагу на псіхалагічны настрой лірычнага героя. Прыгадаем, напрыклад, радкі з верша «Зімовая дарога»: *Уюцца змейкай срабрыстай дарожкі, // Брызгі золата ў небе блішчаць… // І лятуць мае лёгкія сані, // Унашуся я ў сінюю даль.* Маляўнічы пейзаж насычаны срэбрам, золатам, сінню, гарманічнае зліццё Чалавека і Прыроды, жыццесцвярджальны пафас і дынамізм выкарыстаных паэтычных памераў спрыяюць узняццю настрою чытача, узнікненню радасці і ўпэўненасці, што ў выніку прыводзіць да трансфармацыі свядомасці, настройвае ўспрымальніка на пазітыў.

Радкі наступнага верша нібы ўздымаюць нас на хвалях, спакойна і мякка гайдаюць нашыя пачуцці, дапамагаюць узвысіцца над будзённым і падумаць пра касмічнае, недасягальнае – такое адначасова блізкае і далёкае для чалавека: *Зорка Венера ўзышла над зямлёю, // Светлыя згадкі з сабой прывяла… // Помніш, калі я спаткаўся з табою, // Зорка Венера ўзышла.* Так, Ганна Какуева, якой прысвечаны накаторыя вершы (мяркуюць, што на напісанне згаданага верша натхніла паэта менавіта яна), несумненна, была для Максіма Багдановіча ідэалам адухоўленасці і прыгажосці душы, да якога ён імкнуўся праз усё сваё жыццё і творчасць. У гэтым рамансе паэт спрабуе раскрыць

чытачу сутнасць паўсядзённага існавання, а таксама перадае свае ўяўленні пра быццё Чалавека ў Сусвеце, звяртае ўвагу на цесную ўзаемасувязь мікра- і макракосмасу: *Глянь іншы раз на яе, – у расстанні // Там з ёй зліём мы пагляды свае... // Каб хоць на міг уваскрэсла каханне, // Глянь іншы раз на яе.*

Яшчэ адно жаночае імя паэтызаваў М. Багдановіч – Вераніка (Залатарова) – пляменніца Д. Дзябольскага. Ён сустрэў яе, калі ёй было толькі два гадкі. Пазней у вершы «Ізноў пабачыў я сялібы…» (1913) гэты вобраз паўстаў як увасабленне жаночай прыгажосці, чысціні, сапраўднага кахання: *Ізноў пабачыў я сялібы, // Дзе леты першыя прайшлі: // Там сцены мохам параслі, // Вясёлкай адлівалі шыбы... // І толькі надпіс «Вераніка», // Па ліпе ўрэзаны ў кары, // Казаў вачам аб тэй пары. // Расці, узмацовывайся, дрэва, // Як манумент жывы, уставай // І к небу надпіс падымай. // Хай нерухомы словы спева: // Чым болі сходзіць дзён, начэй, // Тым імя мілае вышэй.*

Шмат радкоў М. Багдановіч прысвяціў чалавеку-творцу, які сваёй самаадданай, плённай працай спрычыніўся да стварэння сапраўдных непахісных, адвечных каштоўнасцей, якія будуць эталонамі для вымярэння вартасці чалавечага жыцця для наступных пакаленняў. Вось як паэт апісвае скрупулёзнасць перапісчыка, які нават не заўважае, як праходзіць дзень, наступае ноч: *На чыстым аркушы, прад вузенькім акном, // Прыгожа літары выводзіць ён пяром, // Устаўляючы паміж іх чорнымі радамі // Чырвоную страку; усякімі цвятамі, // Рознакалёрнымі галоўкамі звяроў // І птах нявіданных, спляценнем завіткоў... // І зноў ён схіліцца, застаўку зноў выводзіць // Няяркім серабром; нячутна дзень праходзіць; // Ужо хутка будзе ноч, і першая гвязда // Благаславіць канец прыгожага труда.* У настуных радках ад першай асобы герой верша – летапісец – распавядае пра свой абавязак, а таксама звяртае ўвагу чытача на важную мэту сваёй працы: *...пільна летапіс другі ўжо год пішу: // Старанна літары малыя вываджу // І спісваю ўсё ад слова і да слова... // І бачанаму мной – я годны веры сведак. // Хай тыя ведаюць, што з’явяцца па нас, // Усю праўду пра жыццё у наш і прошлы час.*

Не цураўся і не баяўся цяжкай працы і сам М. Багдановіч, пачынаючаму творцу ён раіў: *Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, // Абрабіць яго трэба з цярпеннем.* А сярод яго спадчыны мы знаходзім разнастайныя паэтычныя формы, якія патрабуць пэўнага ўзроўню валодання мастацкім словам. *Ёсць чары у забытым, старадаўным; // Прыемна нам сталецця пыл страхнуць // Пажыць мінулым – гэткім мудрым, слаўным, – // Мы любім час далёкі ўспамянуць. // Мы сквапна цягнемся к старым паэтам, // Каб хоць душой у прошлым патануць. // Таму вярнуўся я к рандо, санетам, // І бліснуў ярка верш пануры мой: // Як месяц зіхаціць адбітым светам, – // Так вершы ззяюць даўняю красой!* – сцвярджаў М. Багдановіч у тэксце, напісанным тэрцынамі.

Многія вершы прасякнуты жыццесцвярджальным пафасам: паэт вучыць цаніць кожнае імгненне, паказвае мімалётнасць і прагажосць быцця, нібы апісвае свой ідэал існавання Чалавека у Свеце: *Маладыя гады, // Маладыя жаданні! // Ні жуды, ні нуды, // Толькі шчасце кахання!.. // Будзь жа, век*

*малады, // Поўны светлымі днямі! // Пралятайце, гады, // Залатымі агнямі!*. Ён выказвае думку пра неабходнасць напоўніць жыццё гармоніяй, прагажосцю, эстэтычным сэнсам: *Жывеш ня вечна, чалавек, – // Пражывi ж у момант век! // Каб хвалявалася жыццё, // Каб больш разгону ў ім было… // Жыві і цэльнасьці шукай, // Аб шыраце духоўнай дбай.*

Гарманічнай прасветленай радасцю насычаны верш пра веснавое шматколернае (нягледзячы на перавагу белага колеру) абуджэнне прыроды «Па-над белым пухам вішняў...». У прыродзе знайшоў М. Багдановіч вытокі паэзіі. Так, у канцы твора паэт робіць выснову пра сувязь прыроды і паэзіі, пра першароднасць і непадзельнасць гэтых дзвюх з'яў: *Па-над белым пухам вішняў, // Быццам сіні аганёк, // Б'ецца, уецца шпаркі, лёгкі // Сінякрылы матылёк. // Навакол усё паветра // У струнах сонца залатых, – // Ён дрыжачымі крыламі // Звоніць ледзьве чутна ў іх… // Песня рвецца і ліецца // На раздольны, вольны свет. // Але хто яе пачуе? // Можа, толькі сам паэт.*

Музыкальнасць, маляўнічасць, поліфункцыянальнасць слова, асацыятыўныя метафары, дынамізм і лёгкасць выкладання думкі – усе гэта асаблівасці творчага стылю М. Багдановіча. Багатая палітра колераў і вобразаў, дакладныя рыфмы, эмацыянальная выразнасць, пошукі гармоніі і красы, эксперыменты з паэтычнымі формамі, тонкае адчуванне з'яў рэчаіснасці і перадача іх праз пачуцці ў творах, а таксама ярка выражаны суб'ектыўны пачатак вершаў М. Багдановіча паспрыялі ўзбагачэнню скарбонкі беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя.